mktp_kd_zg&scale_y=lin&ind_y=false&rdim=region&idim=country:VEN&if dim=region&tstart=261370800000&tend=969397200000&hl=en_US&dl=en_ US&ind=false. — Date of access: 20.09.2012.
2. Oil Price History and Analysis // WTRG Economics [Electronic resource]. — Mode of access: http://www.wtrg.com/prices.htm. — Date of access: 20.09.2012.
3. Сапожников, К. Уго Чавес / Константин Сапожников. — М.: Молодая Гвардия, 2011. — 470 [10] с.
4. Гонсалес, Ф. «Задачи Венесуэлы»: истоки, проблемы, перспективы / Франклин Гонсалес // Латинская Америка. — 1997. — № 1. — С. 34–43.
5. Куполо, М. Нефть и политика / Марко Куполо // Латинская Америка. — 1997. — № 1. — С. 44–50.

## Менская жытніца ў перыяд маскоўскай акупацыі (1655–1660 гг.)

*Казанцаў Я. Я., студ. IV к. БДУ,*
*навук. кір. Любы А. У., канд. гіст. навук, дац.*

У азначаны перыяд з'явіліся актавыя крыніцы, звязаныя з улікам хлеба ў жытніцы менскага гарнізону маскоўскага войска. Падлікі дазваляюць уявіць стан млынарства.

Пералік «панского пустовытного хлѣба» складзены ротмістрам Барысам Фразінавым ды капітанамі Нікітам ды Цімафеем Жамчужнікавымі для цара Аляксея Міхайлавіча пасля 20 лютага 1656 г.: «ржи 47 бочекъ, муки аржаные 8 бочекъ, ечменю пол-9 бочьки, сухарей 3 бочьки, крупъ гречишныхъ и яшныхъ пол-6 бочьки, овса 3 бочки, гречихи 4 бочьки, и всего 79 бочекъ хлеба [1, с. 183–184]». «Пол-9» і «Пол-6» — гэта 8,5 і 5,5 адпаведна.

У ліпені набыццё збожжа стала праблематычным, на што цару скардзіўся маскоўскі поп Іван, які прыбыў у Менск з ваяводай. Кошт на жыта быў наступны: «менскую четверть, а наша московская осьмина купят в 3 рубли». Усяго перад выездам поп меў 10 рублёў, але не меў на чым ехаць і быў вымушаны набыць «кляченко», з-за чаго не мог набыць збожжа. А гэта і так было няпроста, бо было «пограблено все, разорено от черкасовъ» [1, с. 191–192]. З літасці цар «велѣл ему нашего жалованья дати в Менску ржи 2 чети» [1, с. 192]. Яшчэ адну прычыну паведамілі менскія мяшчане: «И у насъ же, сиротъ твоихъ, покупаютъ салдаты хлѣбы и всякой харчь, а дают намъ, сиротамъ твоимъ, мѣдныя деньги и мѣдныя тарели и четвертины. А у насъ, государь, мѣдных денегъ и мѣдных тарелей и четвертинъ в ыных городѣх и в Менску не емлютъ и в уѣзде нихто» [1, с. 196–197]. Гэта значыць, што медныя маскоўскія манеты лічыліся непаўнавартаснымі.

У верасні збор збожжа быў ускладнены пагаршэннем адносінаў з запарожскімі казакамі, якія таксама рабавалі сялянаў. Ваявода Фёдар

Арсеньеў быў вымушаны біць чалом цару, каб той скараціў спагнанні. Памер быў «с волоки… хлѣба по бочке ржи, по бочке овса, по четверику крупъ». Пасля чалабітнай стаў «по полубочке ржи, по полубочке овса». Бочцы адпавядалі «2 чети московской мѣры» [1, с. 200–201], а паўбочцы — адна.

Між тым Ф. Арсеньеў памёр, а на яго месца 26 лістапада быў прысланы ваявода Васіль Якаўлеў з царскай граматай ад 13 числа, пра што потым напісаў у адрасаванай цару «отписке» [1, с. 203–205]. 30 лістапада 1656 г. маскоўскія цалавальнікі зафіксавалі ў «скаске» наступны стан жытніцы: «Менской мѣры, ржи 410 четвертей, овса 225 четвертей, ячменю 112 четверти, ячных групъ 33 четверти, пшеницы 30 четвертей, гречки 7 четвертей, гороху 3 четвертей, да меду пол-третьи бочки да кадушечка, да в лубке скудной пуд, а тово меду вѣсить неначемъ: — кантарей нѣтъ» [1, с. 203]. Таксама згаданыя сухары, але без указання колькасці. Якаўлеў даслаў у Маскву «скаску» разам з «отпискою». Цар быў незадаволены падрабязнасцю звестак [1, с. 205]. Пасля 17 сакавіка 1657 г. Якаўлеў зафіксаваў стан жытніцы на момант яго прыбыцця ў Менск: «ржи 429 чети, овса 220 чети, ячменю 120 чети, пшеницы 28 чети, круп ячных и прусеныхъ 30 чети, сухарей 15 чети, гречихи 6 чети, гороху 3 чети» [1, с. 207–208]. Заўважнае перабольшанае значэнне жыта з ячменем ды нязначна паменшанае значэнне аўса, ячных крупаў, пшаніцы, грэчкі. Хутчэй за ўсё, гэта хібнасць.

У той час у Менску знаходзіўся гарнізон колькасцю «3 роты солдат, а в роте человек по 70 и по 50» [1, с. 207]. Якаўлеў выдаваў ім правіянт з жытніцы «на два мѣсяца: на генварь дано ржи 120 чети, на мѣсяцъ мартъ дано ржи 109 чети с осминою, ячменю 65 чеьт, овса 45 чети». Рэшта склала: «ржи 195 чети, ячменю 40 чети, гречихи 6 чети, гороху 3 чети, сухарей 15 чети; и всего… 468 чети Менские мѣры» [1, с. 207–208].

У лісце Якаўлева адзначаецца прапарцыянальнасць маскоўскіх і менскіх хлебных мераў: «московская осмина, а менская четь» [1, с. 208]. Вынікае наступная прапорцыя:

1 асміна маскоўская = 1 чвэрць менская = 4 чвэрыкі маскоўскія;

1 чвэрць маскоўская = 2 чвэрці менскіх = 1 паўбочак = 8 чвэрыкаў маскоўскіх;

2 чвэрці маскоўскіх = 4 чвэрці менскіх = 1 бочка = 16 чвэрыкаў маскоўскіх.

Цяжка вызначыць, колькі валокаў было абабрана, бо значэнні аўса ды жыта значна адрозніваюцца, нягледзячы на супадзенне нормаў. Таксама незразумела, якія крупы ў норме меліся на ўвазе. Хутчэй за ўсё, пры спагнанні збожжа салдаты забіралі столькі, колькі было.

Адсутнасць мукі ў жытніцы пасля лютага 1656 г. сведчыць аб заняпадзе млынарства. Бітва за ўраджай 1656 г. была бітвай у прамым сэнсе, таму было немэтазгодна перамолваць вялікую колькасць збожжа для далейшага захавання мукі ў жытніцы. Збожжа перамолвалася толькі салдатамі перад непасрэдным ужываннем.

Табліца 1

Менская жытніца ў 1656-1657 гг. паводле актаў БА т. 3 №№ 117, 141, 147 (у чвэрцях менскай меры).

| | 02.1656 | 30.11.1656 | 26.11.1656 | Выдача салдатам на 01.1657–02.1657 | Выдача салдатам на 03.1657–04.1657 | Рэшта (вылічана) | Рэшта на 17.03.1657 | Страты падчас захоўвання (вылічана) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Жыта | 188,0 | 410,0 | 429,0 | 120,0 | 109,5 | 199,5 | 195,0 | -4,5 |
| Авёс | 12,0 | 225,0 | 220,0 | | 45,0 | 175,0 | 155,0 | -20,0 |
| Ячмень | 34,0 | 112,0 | 120,0 | | 65,0 | 55,0 | 40,0 | -15,0 |
| Ячныя крупы | 22,0 | 33,0 | 30,0 | | | 30,0 | 30,0 | |
| Пшаніца | | 30,0 | 28,0 | | | 28,0 | 27,0 | -1,0 |
| Грэчка | 16,0 | 7,0 | 6,0 | | | 6,0 | 6,0 | |
| Гарох | | 3,0 | 3,0 | | | 3,0 | 3,0 | |
| Сухары | 12,0 | | 15,0 | | | 15,0 | 15,0 | |
| Мука жытняя | 32,0 | | | | | | | |
| Усяго (вылічана) | 316,0 | 820,0 | 851,0 | | | 511,5 | 471,0 | -40,5 |
| Усяго (крыніца) | 316,0 | | | | | | 468,0 | |

Табліца 2

| Менская жытніца ў 1656-1657 гг. паводле актаў БА т. 3 №№ 117, 141, 147 (у кг). | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 02.1656 | 30.11.1656 | 26.11.1656 | Выдача салдатам на 01.1657-02.1657 | Выдача салдатам на 03.1657-04.1657 | Рэшта (вылічана) | Рэшта на 17.03.1657 | Страты падчас захоўвання (вылічана) |
| Жыта | 9238,32 | 20147,40 | 21081,06 | 5896,80 | 5380,83 | 9803,43 | 9582,30 | -221,13 |
| Авёс | 589,68 | 11056,50 | 10810,80 | | 2211,30 | 8599,50 | 7616,70 | -982,80 |
| Ячмень | 1670,76 | 5503,68 | 5896,80 | | 3194,10 | 2702,70 | 1965,60 | -737,10 |
| Ячныя крупы | 1081,08 | 1621,62 | 1474,20 | | | 1474,20 | 1474,20 | |
| Пшаніца | | 1474,20 | 1375,92 | | | 1375,92 | 1326,78 | -49,14 |
| Грэчка | 786,24 | 343,98 | 294,84 | | | 294,84 | 294,84 | |
| Гарох | | 147,42 | 147,42 | | | 147,42 | 147,42 | |
| Сухары | 589,68 | | 7518,42 | | | 7518,42 | 737,10 | |
| Мука жытняя | 1310,40 | | | | | | | |
| Усяго (вылічана) | 15266,16 | 40294,80 | 48599,46 | | | 31916,43 | 23144,94 | -8771,49 |
| Усяго (крыніца) | 15266,16 | | | | | | 22997,52 | |

Для большай навочнасці з дапамогай праграмы «Microsoft Excel» паводле актаў №№ 117, 141, 147 [1, с. 183–184, 203, 207–208] была складзеная табліца № 1. Для пераводу звестак у метрычную сістэму быў выкарыстаны дапаможнік «Русская метрология» [2]. Аўтары адзначаюць, што ў Рускай цэнтралізаванай дзяржаве з другой чвэрці XVII ст. да 1679 г. чвэрць утрымлівала 6 пудоў жыта [2, с. 131]. Для жытняй мукі значэнне было 5 пудоў [2, с. 104]. Пуд утрымліваў 16,38 кг [2, с. 142]. Так была складзена табліца № 2.

Таксама аўтары сцвярджаюць, што памер раздавальнай меры вагаўся ад 0,75 да 0,37 адносна прымальнай [2, с. 132]. У нашым выпадку вылічаныя значэнні стратаў збожжа пры захоўванні не прапарцыянальныя значэнням выдачаў ды адмоўныя, што ніяк не сведчыць аб меншым памеры раздавальных чвэрцяў адносна прымальных.

**Літаратура**

1. Беларускі архіў : у 3 т. / склад. З. Даўгяла. — Мінск : Інстытут беларускай культуры, 1927–1930. — Т. 3: Менскія акты. Вып. 1 (XV–XVIII ст.) / З. Даўгяла. — 1930. — 413 с.

2. Каменцева, Е. И., Устюгов Н. В. Русская метрология. Учеб. пособие. / Е. И. Каменцева, Н. В. Устюгов — Изд. 2-е. — М.: Высш. школа, 1975. — 328 с.

## Правовые основы концепции «обязанности защищать» в Учредительном акте Африканского союза

*Конколович Д. О., магистрант БГУ,*
*науч. рук. Зыбайло А. И., канд. юр. наук, доц.*

Учитывая имевшую место на африканском континенте неспособность ООН и Организации Африканского Единства вмешаться в случаях грубых нарушений прав человека, а также перед лицом угроз новых гуманитарных кризисов Ассамблея глав государств и правительств Африканского союза (далее — АС) включила право на вмешательство со стороны АС в его Учредительный акт [1]. Статья 4(h) Учредительного акта закрепляет «право Союза вмешиваться в дела государства-члена в соответствии с решением Ассамблеи в случае серьезных обстоятельств, а именно: военных преступлений, геноцида и преступлений против человечности». Таким образом, за пять лет до принятия концепции «обязанности защищать» на Всемирном саммите 2005 года [2] АС уже закрепил основные элементы данной концепции в своем Учредительном акте.